**НЕВЯЛІЧКІ архіпелаг у паўднёвай частцы Ціхага акіяна апынуўся ў цэнтры сусветнай палітыкі. У Новай Каледоніі ўжо больш чым два тыдні працягваюцца маштабныя пратэсты, якія ладзяцца прыхільнікамі аддзялення гэтай заморскай тэрыторыі ад Францыі. Беспарадкі перараслі ў сапраўдную партызанскую вайну, улады ўжо называюць іх «паўстаннем». Французы ўвялі на тэрыторыю, размешчаную за 17 тысяч кіламетраў ад Парыжа, свае войскі. Пры гэтым кантынгент працягвае пашырацца. Што ж адбываецца ў Новай Каледоніі, чаго чакаць надалей?**

# ХРОНІКІ МЯЦЕЖНАГА АРХІПЕЛАГА

## Што адбываецца ў Новай Каледоніі?

### ГОНАР КАНАКАЎ

Новая Каледонія — архіпелаг, які ўключае ў сябе адзін вялікі і групу дробных астравоў. Гэтае «асаблівае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўтварэнне» Пятай рэспублікі размешчана ў паўднёвай частцы Ціхага акіяна прыкладна за 1300 км на ўсход ад Аўстраліі і ў 2000 км на поўнач ад Новай Зеландыі. Насельніцтва — каля 270 тысяч чалавек, з якіх у сталіцы Нумеа пражываюць каля 100 тысяч. Амаль палова з іх — карэнны народ канакі.

Архіпелаг у 1774 годзе адкрыў знакаміты англійскі мараплавец Джэймс Кук, пасля чаго там пачалі з'яўляцца паселішчы еўрапейскіх каланізатараў. Французы завалодалі востравам у 1853 годзе, калі Напалеон III абвясціў гэтую тэрыторыю часткай імперыі, а пасля ператварыў яе ў папраўчую калонію. Дзясяткі тысяч зняволеных былі адпраўлены на работу ў нікелевыя шахты і на плантацыі. Канакаў сагналі ў рэзервацыі. Адбылася серыя паўстанняў, якія жорстка задушылі.

**По меркаванні экспертаў, рэакцыя Парыжа на падзеі ў Новай Каледоніі паказвае значэнне гэтай тэрыторыі для Францыі. На архіпелагу знаходзіцца адно з найбуйнейшых радовішчаў нікелю ў свеце, таксама ёсць радовішчы хрому, кобальту, марганцу, срэбра, золата, свінцу, медзі.**

У рэшце рэшт канакам дазволілі вярнуцца на радзіму. Яны сцвярджалі, што сацыяльна і эканамічна маргіналізаваны, таму зноў узяліся за зброю пад кіраўніцтвам арганізацыі, вядомай як FLNKS (Нацыянальны канакскі сацыялістычны фронт вызвалення). Барацьба была жорсткая — у 1984 годзе Элай Мачора, «Чэ Гевара Ціхага акіяна», быў застрэлены паліцэйскім снайперам. «Вы можаце забіць рэвалюцыянера, але вы не можаце забіць яго ідэі», — гэтыя словы высечаны на яго надмагільным камені, дзе кожны год збіраюцца людзі, каб успомніць яго. Праз чатыры гады баевікі канакаў забілі чатырох жандармаў і ўтрымлівалі 27 закладнікаў у каралавай пячоры. Французскія вайскоўцы тады застрэлілі 19 чалавек падчас штурму.

У 1998-м Парыж і Нумеа (сталіца тэрыторый) падпісалі Нумейскае пагадненне, паводле якой праз 20 гадоў у Новай Каледоніі правядуць тры рэферэндумы аб будучыні астравоў. На ўсіх трох плебісцытах жыхары выступілі супраць незалежнасці ад Францыі. Новая Каледонія захоўвае значную аўтаномію, але пры гэтым залежыць ад Парыжа ў пытаннях адукацыі, абароны і атрымлівае ад яго субсідыі. Францыю тут прадстаўляе вярхоўны камісар, якога прызначае прэзідэнт Пятай рэспублікі. Выканаўчая ўлада — у руках мясцовага ўрада.

Сітуацыя абвастрылася сёлета ў сярэдзіне мая, калі мірная дэманстрацыя прыхільнікаў незалежнасці, якая праходзіла ў Нумеа, перарасла ў пагромы. Былі спалены і разрабаваны сотні крам, аптэк і АЗС. Паведамляецца аб па меншай меры шасці загінулых, у тым ліку двух жандармах, а таксама сотнях пацярпелых. З таго часу як мірныя пратэсты, так і сутычкі з паліцыяй, пагромы і падпалы на астравах працягнуліся, прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон аб'явіў тут надзвычайнае становішча. Пасля прэм'ер-міністр Габрыэль Аталь паведаміў, што на архіпелаг адпраўлены вайсковыя часці, якія возьмуць пад ахову аэрапорты і акіянскія гавані.

### АСАБЛІВАЯ ТЭРЫТОРЫЯ

Прычынай беспарадкаў стаў праект канстытуцыйнага закона Францыі, паводле якога тыя, хто пражыў у Новай Каледоніі больш за дзесяць гадоў, могуць галасаваць на мясцовых выбарах. Пры гэтым цяпер права голасу на архіпелагу ёсць толькі ў тых, хто ўнесены ў выбарчыя спісы на момант падпісання ў 1998 годзе Нумейскага пагаднення, якое дало тэрыторыям значную аўтаномію ад Францыі, і іх дзяцей. Новы закон выклікаў абурэнне ў прыхільнікаў незалежнасці Новай Каледоніі — яны асцерагаюцца, што, калі электарат пашыраць за кошт еўрапейцаў, якія пераехалі на архіпелаг за апошнія дваццаць гадоў, яны застануцца ў меншасці. 14 мая законапраект ухваліў нацыянальны сход Францыі (ніжняя палата). Планавалася, што канчаткова дакумент павінны зацвердзіць у чэрвені на сумесным пасяджэнні дзвюх палат у Версалі. Гэта значыць, пратэсты на астравах успыхнулі напярэдадні галасавання ў ніжняй палаце парламента Пятай рэспублікі.

Французскія ўлады абвінавацілі ў тым, што адбываецца, Азербайджан — па іх ацэнцы, Баку ўмешваецца ў справы Новай Каледоніі, падтрымліваючы там рух за незалежнасць. Аб гэтым заявіў кіраўнік французскага МУС Жэральд Дарманен у эфіры тэлеканала France 2. МЗС Азербайджана абвінавачванні катэгарычна аспрэчыў, назваўшы іх «абразлівымі выказваннямі» і заклікаўшы «спыніць паклёпніцкую кампанію». «Замест таго каб абвінавачваць Азербайджан у нібыта падтрымцы пратэстаў за незалежнасць у Новай Каледоніі, міністру ўнутраных спраў Францыі трэба было б засяродзіцца на правальнай палітыцы сваёй краіны ў дачыненні да заморскіх тэрыторый, якая прывяла да такіх пратэстаў», — адзначаецца ў заяве ведамства.

По меркаванні экспертаў, рэакцыя Парыжа на падзеі ў Новай Каледоніі паказвае значэнне гэтай тэрыторыі для Францыі. На архіпелагу знаходзіцца адно з найбуйнейшых радовішчаў нікелю ў свеце, таксама ёсць радовішчы хрому, кобальту, марганцу, срэбра, золата, свінцу, медзі. Паводле даных Інстытута статыстыкі і эканамічных даследаванняў Новай Каледоніі, аб'ём экспарту рэгіёна летась склаў звыш 2,1 мільярда долараў. Заморскія тэрыторыі дазваляюць Пятай рэспубліцы мець выключную эканамічную зону. Дзякуючы ім Францыя можа ўдзельнічаць ва ўнутраных працэсах Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна (АЦР) — аднаго з найбольш перспектыўных рэгіёнаў свету, — пашыраючы свой геапалітычны ўплыў. Гэта тэрыторыя мае стратэгічнае значэнне для Парыжа. Францыя спрабуе пазіцыянаваць сябе ў якасці незалежнага гульца на сусветнай арэне, выступаючы за стратэгічную аўтаномію Еўропы ад Вашынгтона. Як паведаміла spbvedomosti.ru, такога пункту гледжання прытрымліваецца, у прыватнасці, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках РАН Наталля Лапіна.



### АПЛЯВУХА ДЛЯ МАКРОНА

У сваю чаргу Павел Цімафееў з Нацыянальнага даследчага інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін РАН заўважае, што ў заморскай тэрыторыі Францыі назіраюцца вялікія ўнутраныя праблемы, у тым ліку разыходжанні паміж карэнным насельніцтвам і прыезджымі. «У Новай Каледоніі адбываецца сур'ёзнае расслаенне грамадства па ўзроўні жыцця: прыезджыя белыя французы больш забяспечаныя, а ў карэннага насельніцтва ўсё горш. Канакі апасаюцца, што прыбаўленне праслойкі белых на архіпелагу будзе ўзмацняць дыскрымінацыю мясцовых, а з часам прывядзе да іх ператварэння ў меншасць на сваёй жа радзіме», — адзначае эксперт. Ён лічыць, што выйсце з гэтай сітуацыі складана ўявіць.

«Макрон спрабаваў перагаварыць з лідарамі пратэсту, але быў праігнараваны. Цяпер Францыя перакідвае сілавікоў, і далейшае развіццё падзей незразумелае. Або войска будзе ўсталёўваць жалезны парадак і нават пральецца кроў, альбо шлях дыялогу пераможа. Важны момант тут у тым, што рэформа французскага парламента пакуль не набыла моц, яе павінны зацвердзіць на ўзроўні абедзвюх палат заканадаўчага органа, пасля чаго яна набудзе канстытуцыйны характар. Да гэтага моманту ёсць час, каб знайсці кампраміс», — мяркуе эксперт.

Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута Еўропы РАН Сяргей Фёдараў лічыць, што калі казаць аб палітычным рашэнні, то яго знайсці Эмануэлю Макрону будзе цяжка, паколькі, з аднаго боку, ён абяцаў канстытуцыйныя рэформы, а з другога — «неабходна знайсці агульную мову з канакскімі сепаратыстамі». «Плюс гэта, вядома, удар па іміджы Макрона. У яго і так унутры краіны, мякка кажучы, не бліскучая цяпер сітуацыя», — тлумачыць аналітык. Акрамя таго, Фёдараў акцэнтаваў увагу на тым, што напярэдадні еўрапейскіх выбараў, мяркуючы па апытаннях, Макрон саступае свайму галоўнаму апаненту — Марын Ле Пэн. «Гэта будзе проста палітычная аплявуха для Макрона, які столькі насіўся з ідэяй палітычнага суверэнітэту Еўропы, стратэгічнай аўтаноміі. Нягледзячы на ўсё гэта, ён з трэскам прайграе гэтыя выбары Марын Ле Пэн. Пакуль усё ідзе да гэтага», — лічыць аналітык. Пры гэтым усе эксперты сыходзяцца на тым, што азербайджанская гісторыя з'яўляецца хутчэй ходам для пераключэння ўвагі на Баку і яго ўплыў на сітуацыю. Проста французскія ўлады выкарыстоўваюць вядомы прыём і праводзяць масіраваную інфармацыйную атаку.



### ЧАС СКІДАЦЬ «КАЙДАНЫ»

Летась у кастрычніку тэма канфлікту ў Новай Каледоніі аказалася ў цэнтры ўвагі Руху недалучэння. На міністэрскім пасяджэнні Каардынацыйнага бюро гэтага руху, якое праходзіла ў Баку, адбылася канферэнцыя «Неакаланіялізм: парушэнне правоў чалавека і несправядлівасць». У ёй узялі ўдзел прадстаўнікі Новай Каледоніі, а таксама Алжыра, Малі, Марока і іншых колішніх і цяперашніх французскіх калоній. Выступаючы на пасяджэнні, намеснік генеральнага сакратара «Каледонскага саюза» Давід Ванаба заявіў, што Новая Каледонія хоча мець уласны палітычны курс, а не заставацца ў «кайданах» Францыі. «Мы не хочам інтэгравацца ў французскае грамадства альбо асіміляваўцца, таму што гэта краіна ўсё яшчэ працягвае весці каланіяльную палітыку», — заўважыў Ванаба.

The Sunday Times наконт уплыву жорсткай каланіяльнай гісторыі Францыі на палітыку гэтай краіны ў Новай Каледоніі заявіла, што гэта стала самым сур'ёзным крызісам за час прэзідэнцтва Эмануэля Макрона. Прадстаўляючы Пятую рэспубліку на міжнароднай футбольнай арэне, Крысціян Карамбэ, нястомны паўабаронца, які ўваходзіў у склад каманды, што выйграла Кубак свету ў 1998 годзе, палічыў за лепшае не спяваць «Марсельезу» перад матчамі, паведаміла брытанскае выданне. Калі яго папрасілі растлумачыць гэта, ён абвінаваціў Францыю ў каланіяльных здзеках. У 1931 годзе Францыя наладзіла выставу, каб паказаць розныя куткі сваёй імперыі. На ёй былі прадстаўлены і 100 канакоў з Новай Каледоніі. З іх знялі адзенне і выставілі ў якасці небяспечных каніблаў у заапарку ў Булонскім лесе ў Парыжы, дзе прымушалі есці сырое мяса і выконваць «дзікунскія» танцы. Адным з гэтых канакаў быў прадзед футбаліста Вілі Карамбэ. «Мая сям'я, як і многія сем'і канакаў, перажыла жудасныя падзеі, — сказаў ён. — Я не магу спяваць нацыянальны гімн Францыі, бо ведаю гісторыю свайго народа».

Тым часам напружанне на ціхаакіянскім архіпелагу не слабее: «Канакі ніколі не адмовяцца ад незалежнасці, — заявіў Дамінік Фочы, адзін з лідараў нацыянальнага руху. — Мы павінны быць пачутыя». Таксама стала вядома, што раней у Тулузе прайшла акцыя салідарнасці з канакамі, а іх сцягі з'явіліся і на дэманстрацыі ў падтрымку палесцінцаў у Парыжы. Пэўна, настаў час скідаць «кайданы».

**Захар БУРАК.**

## Даслоўна

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ГАЙДУКЕВІЧ:**

— Падзеі, якія адбываюцца там, — яшчэ адно пацвярджэнне двайных і трайных стандартаў Захаду. Яны ўвесь час любяць вучыць дэмакратыі, свабодзе, правам чалавека іншыя краіны, асабліва дзяржавы постсавецкай прасторы, Афрыкі, Блізкага Усходу. А самі ніякіх стандартаў не выконваюць. Зыходзяць толькі са сваіх геапалітычных інтарэсаў, зыходзяць з таго, як ім выгадна рабаваць, прыніжаць. І тое, што адбываецца, — яскравае пацвярджэнне таму, што ніякай свабоды, ніякай дэмакратыі, ніякіх правоў чалавека і блізка там няма. І вучыць іх нам сапраўды няма чаму. Яны ўвесь час жылі за чужы кошт. Увесь дабрабыт Захаду пабудаваны на тым, што яны праводзілі каланіяльную палітыку, кралі і рабавалі. І сёння ўся барацьба Захаду з іншымі краінамі адбываецца таму, што яны не хочуць жыць за свой кошт. Ім хочацца зноў рабаваць.


## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Гомельхлебпром» (продавец) извещает о проведении 12 июня 2024 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условия продажи:** срок разработки проектной документации не более двух лет с даты заключения договора купли-продажи, срок начала реконструкции приобретенного имущества в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации и срок их окончания – нормативный срок согласно разработанной и утвержденной проектной документации. За неисполнение обязательных условий продажи покупатель уплачивает штраф в размере трех процентов от цены продажи недвижимого имущества. В течение одного года после уплаты либо поступления первого платежа в счет уплаты указанного штрафа покупатель устраняет допущенные нарушения. Неисполнение обязательных условий продажи по истечении двух лет после уплаты либо поступления первого платежа в счет уплаты указанного штрафа, а также неуплата указанного штрафа являются основанием для расторжения договора купли-продажи по соглашению сторон либо по решению суда. При расторжении договора купли-продажи недвижимое имущество возвращается продавцу, в том числе с учетом выполненных покупателем неотделимых улучшений, без возмещения их стоимости, без возврата покупателю денежных средств, уплаченных им за недвижимое имущество. Не допускается залог приобретенного имущества, а также удовлетворение за счет него требований кредиторов в процессе экономической несостоятельности (банкротства) до выполнения покупателем обязательных условий продажи. До истечения срока выполнения обязательных условий продажи допускается отчуждение покупателем недвижимого имущества по согласованию с Гомельским областным исполнительным комитетом, а также отчуждение такого имущества в процессе исполнительного документа или ликвидации покупателя с сохранением обязательств по исполнению обязательных условий продажи за новым покупателем. При этом на нового покупателя распространяется ограничение по залогу и удовлетворению требований кредиторов в процессе экономической несостоятельности (банкротства) | | | |
| 1 | - **Капитальное строение** с инв. № 322/С-16607 общей площадью **4555,6 кв. м**, наименование – здание главного корпуса хлебзавода; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-16601 общей площадью **410,7 кв. м**, наименование – одноэтажное кирпичное здание материального склада; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-17955 общей площадью **372,1 кв. м**, наименование – гаражи с пристроенным складом; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-17957 общей площадью **55,1 кв. м**, наименование – одноэтажное бетонное здание склада; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-16606 общей площадью **17,8 кв. м**, наименование – одноэтажное кирпичное здание проходной; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-18311 общей площадью **575,0 кв. м**, наименование – двухэтажное кирпичное нежилое здание административного корпуса; **- капитальное строение** с инв. № 322/С- 22791 общей площадью **65,8 кв. м**, наименование – холодильник; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-22792 общей площадью **5,9 кв. м**, наименование – здание для обслуживания артскважин; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-16603 общей площадью **178,3 кв. м**, наименование – магазин № 2 «Горячий хлеб»; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-30306, общей площадью **69,0 кв. м**, наименование – резервуар противопожарный; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-30299 протяженностью **39,6 м**, наименование – внеплощадочные сети канализации от производственной территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачев; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-30298 протяженностью **507,7 м.**, наименование – внутриплощадочные сети канализации на производственной территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачев; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-30303 протяженностью **296,3 м.**, наименование – электроосвещение территории по ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачев; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-30304 протяженностью **251,8 м**, наименование – хозяйственно-производственный водопровод на производственной территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачев; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-30300 протяженностью **79,5 м**, наименование – газопровод к зданию главного корпуса по ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачев; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-30301 протяженностью **90,8 м**, наименование – кабельная линия КЛ-10кВ № 2042 на территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачев; **- капитальное строение** с инв. № 322/С-30302 протяженностью **653,3 м**, наименование – кабельная линия КЛ-10кВ № 134 к производственной территории ул. Сергея Кирова, 35 в г. Рогачев.<br>**Объекты расположены** на земельном участке с кадастровым номером **324750100003001372 площадью 2,9421 га** (право постоянного пользования) по адресу: Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Сергея Кирова, 35.<br>**Так же в состав лота № 1 входит**: - кабельная линия (пряничный цех), инв. № Р021008; - паропровод, инв. № Р021012; - мукопровод, инв. № Р021011; - артскважина, инв. № Р0010024; - артскважина, инв. № Р0010021; - зеленые насаждения, инв. № Р0000461; - зеленые насаждения, инв. № Р0000382; - термостат ТС 80 М-2, инв. № Р0000040; - система сбора телеметрии ИДНЛ-170, инв. № Р0000134; - весы автомобильные, инв. № Р0000255; - холодильная камера, инв. № Р0000263; - подкатной двухголовочный автомат ДАС-600, инв. № Р0000267; - автоматическая система дозирования муки и жидких компонентов, инв. № Р0000281; - печь пряничная PTG, инв. № Р0000288; - фильтр обезжелезования, инв. № Р0000375; - морозильная камера, инв. № Р0000369; - емкость 1,5 м куб., инв. № Р0000768; - трансформатор 400/10, инв. № Р0000820; - регулятор реактивной мощности, инв. № Р0000824; - бак металлический 8 м куб., инв. № Р0000917; - измерительный комплекс СГ-ЭКВ-Р-05-65/16, инв. № Р0000923; - дозатор сыпучих компонентов, инв. № Р00502; - узел коммерческого учета газа, инв. № Р0200790; - котел КП 0,5 в комплекте с горелкой, инв. № Р0200838; - котел КВ 0,36 в комплекте с горелкой, инв. № Р0200839; - шкаф управление котельной, инв. № Р0200840; - уравнитель гидравлический ДУ-100 котельной, инв. № Р0200841; - насос сетевой 12033 в котельной, инв. № Р0200842; - насос сетевой МН1203 в котельной, инв. № Р0200843; - насос сетевой МКО ДР 40/115-0.55/2 в котельной, инв. № Р0200844; - бак водомерный БС-100 заквасочное отделение, инв. № Р0200845; - станция дозировочная СДМ 4х6 заквасочное отделение, инв. № Р0200846; - бак водомерный БС-100 заквасочное отделение, инв. № Р0200851; - насос сетевой МН1203 в котельной, инв. № Р0200852; - насос сетевой 12033 в котельной, инв. № Р0200855; - насос сетевой МН1203 в котельной, инв. № Р0200854; - котел КП 0,5 в комплекте с горелкой, инв. № Р0200856; - аппарат для охлаждения воды, инв. № Р0200858; - бак расширительный в котельной, инв. № Р0200860; - клапан регулирующий КРПС в котельной, инв. № Р0200861; - установка умягчения воды в котельной, инв. № Р0200862; - установка контроля времени в заквасочном, инв. № Р0200863; - камера холодильная КХМ-9, инв. № Р020900; - камера холодильная, инв. № Р020927; - котел варочный, инв. № Р020934; - автоматизированная станция управления дозированием муки, инв. № Р020955; - инженерная система охлаждения (кулеров), инв. № Р020961; - холодильный агрегат amz-120, инв. № Р020962; - автоматизированная система дозирования муки, инв. № Р020964; - автоматизированная система дозирования жидких компонентов, инв. № Р020965; - технологическая линия приготовления заквасок по 4-стадийной технологии, инв. № Р020966; - мойка нерж, инв. № Р020981; - баки для муки - (2 ед), инв. № Р020982; - система видеонаблюдения хлебозавода, инв. № Р1111163; - теплообменный аппарат двухсекционный, инв. № Р0000378; - водомерный узел, инв. № Р0000464; - щит распределительный ШР-11, инв. № Р0000813; - щит распределительный ШР-11, инв. № Р0000814; - щит распределительный ШР-11, инв. № Р0000815; - щит распределительный ШР-11, инв. № Р0000816. | **2 603 856,00** | 130 192,80 |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Гомельхлебпром», 246045, г. Гомель, ул. Интернациональная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляется по контактному тел. **8 (029) 122-89-32, Бондаренко Юрий Владимирович.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (открытое акционерное общество «Гомельхлебпром»):** р/с BY55 BLBB 3012 0400 0106 7400 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400010674, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 1 июня 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 июня 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество Продавцу в размере 30 % от цены продажи имущества в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** с момента заключения договора, 70 % от цены продажи ежемесячно равными долями в течение календарного года с момента заключения договора с индексацией платежей в соответствии с постановлением Государственного комитета по имуществу Республике Беларусь от 22.10.2019 г. № 14 «О порядке расчета платежей при рассрочке оплаты стоимости государственного имущества».

Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»).**

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 30.04.2024 г. № 85 (30219).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**



## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное предприятие
«УКС Фрунзенского района г. Минска»

*(во изменение к ранее опубликованной декларации в газете «Звязда» от 20.06.2023 № 116 (29996))*

Застройщик – государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 за № 190580553.

Место нахождения: 220074, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А.

Тел./факс (8017) 361 67 99; (8017) 399 53 94; (8017) 399 53 91; (8017) 370 84 18; (8044) 785 84 81; (8029) 323 11 11.

Режим работы – приемное время: понедельник–четверг с 8.45 до 18.00; обеденный перерыв с 13.00 до 14.00; выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Проектом предусмотрено строительство объекта «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 1» (1-я очередь строительства). Жилой дом № 28 по генплану со встроенными торговыми помещениями непродовольственных товаров с изолированным от жилой части входами.

Предлагается для участия в долевом строительстве встроенное торговое помещение непродовольственных товаров № 1 общей площадью 58,41 кв. м для физических и юридических лиц, индивидуальных предпринимателей.

Внутренняя отделка помещения:

стены и перегородки – окраска по штукатурке поливинилацетатными водоэмульсионными составами улучшенная;

покрытие полов – плиты повышенной прочности из керамогранита;

отделка потолков – подвесные потолки типа «Армстронг»;

окна – профиль ПВХ;

двери внутренние – деревянные.

Цена 1 кв. метра общей площади на дату опубликования проектной декларации составляет – 5 172,23 бел. руб.;

С планировкой встроенного торгового помещения непродовольственных товаров можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64А, к. 101, 102.

Для заключения договора создания объекта долевого строительства необходимо:

- свидетельство о государственной регистрации юридического лица/индивидуального предпринимателя;
- реквизиты юридического лица;
- документы, подтверждающие полномочия на выполнение юридически значимых действий;
- паспорт (для физического лица);
- быть готовым оплатить в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента получения договора 60 процентов от общей стоимости объекта долевого строительства.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТРЕТЬИХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

**Аукцион состоится 11.06.2024, начало: 10.00, окончание: 16.00 на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by. Время приема заявок: с 01.06.2024 09.00 до 10.06.2024 г. 17.00**

**Организатор аукциона, оператор ЭТП:** ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

**Продавец:** ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

Иная информация о предмете электронных торгов, его начальной и минимальной цене, порядке их проведения, в том числе об оформлении участия в торгах, определении лица, выигравшего торги, в ранее опубликованном извещении о проведении публичных электронных торгов (аукциона) в газете «Звязда» № 96 от 18.05.2024 (30230), стр. 11, а также на сайте ЭТП iintorgi.by

**Контакты: тел: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by.**

УНП 291442411